# Паездка пажылых грамадзян у тэатр г. Мінска у рамках клуба "Турысты-аптымісты"

11красавіка 2019 года для наведвальнікаў аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна» была арганізавана паездка ў сталіцу нашай Беларусі г. Мінск у Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр г. Мінска.

Сцэна музычнага тэатра ператварылася ў узбярэжжа Вялікабрытаніі і гледачы змаглі ўбачыць прэм'еру балета "Тытанік" і перажыць трагедыю брытанскага трансатлантычнага лайнера. У балеце было выдатна ўсё-харэаграфія, музыка, дэкарацыі, касцюмы! Атмасфера падчас прагляду проста зашкальвала эмоцыі гледачоў.

На сённяшні дзень Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр-гэта адна з найбуйнейшых тэатральна-відовішчных устаноў Беларусі, самы папулярны і любімы ў краіне. Рады што ў нашай краіне ёсць творчыя людзі, якія ствараюць тэатральныя шэдэўры.



